**Л.І.Доўнар,**
*кандыдат педагагічных навук,*
*Беларускі дзяржаўны універсітэт*
*культуры і мастацтваў*

# “РАЗГАРНІ КНІГУ – РАЗГАРНІ СВЯДОМАСЦЬ”: КНІГАЗНАЎЧЫЯ ВЕДЫ Ў ПАДРЫХТОЎЦЫ БІБЛІЯТЭКАРАЎ

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Інфарматызацыя і камерцыялізацыя, якія дэманструюць толькі вяршыню айсберга змен у сучасным грамадстве, набываючы разнастайныя формы інавацыйнай дзейнасці і ў бібліятэчнай справе, здавалася б, усё больш звужаюць гэтую сферу ў адносінах да традыцыйнай кнігі. Аднак нават у тэхналагічна развітых краінах з высокім узроўнем камп’ютэрызацыі і інфарматызацыі кніга не страчвае свайго значэння (як у выдавецкай галіне, так і ў галіне распаўсюджання), а даследаванні, якія праводзяцца ў кнігазнаўстве (бібліялогіі), актуалізуюць ролю кнігі ў сучаснай культуры, раскрываючы прастор для сацыяльнай інавацыйнай дзейнасці. Прыкладам гэтаму служыць праведзеная ў 2007 г. Таварыствам па вывучэнні гісторыі аўтарства, чытання і друку (SHARP – адна з вядучых міжнародных арганізацый у галіне даследавання кнігі) у ЗША (Мінеапаліс) Міжнародная навуковая канферэнцыя “Разгарні кнігу – разгарні свядомасць” (“Open the Book, Open the Mind”) [6].

Цікава, што сугучныя тэме канферэнцыі і ідэі расійскіх кнігазнаўцаў. Напрыклад, на думку А.А.Белавіцкай, “конечная цель должна заключаться не в компьютеризации ради компьютеризации, а в том, чтобы ее средствами освободить человека от рутинных работ и занятий и дать ему время для воспроизводства самого себя как субъекта общественной деятельности, полноценно жизнедействующего в контексте не только современной цивилизации, но и всей предшествующей культуры” [1]. Кніга, адзначае аўтар, – гэта спосаб адлюстравання і сродак фарміравання індывідуальнай, групавой і грамадскай свядомасці, спосаб сацыяльнай камунікацыі, актуалізаваны кніжнай справай. Дадзеныя высновы асабліва надзённыя і для адукацыйнага працэсу ў падрыхтоўцы будучых бібліятэчных спецыялістаў, бо сапраўдныя веды грунтуюцца “на книжном научении” [1, с. 169].

“Кніжнае навучанне”, на нашу думку, уключае не толькі выкарыстанне традыцыйных кніжных вучэбных выданняў (сёння відавочна, што неабходна іх спалучэнне з электроннымі,

інтэрактыўнымі сродкамі навучання), але і набыццё кнігазнаўчых ведаў (тэарэтычных і практычных), валоданне якімі дазволіць з дакладных метадалагічных пазіцый падыходзіць да аналізу, інтэрпрэтацыі і ацэнкі любой з’явы кнігі, разумення яе сутнасці ў сваёй дзейнасці.

Паліятыўны (часовы і хутказменлівы) характар інфармацыі, які пераўтвараецца ў першааснову ведаў для будучых спецыялістаў бібліятэчнай справы, не спрыяе ні практыцы, ні фундаментальнай падрыхтоўцы саміх спецыялістаў. На наш погляд, дуалістычнасць спецыяльных тэарэтычных ведаў, а менавіта, з аднаго боку, апярэджванне практыкі тэорыяй, з другога – “апраўдванне” практыкі тэорыяй спараджаюць такую сітуацыю, калі тэарэтычныя веды застаюцца неактуальнымі з той прычыны, што яны не знаходзяць практычнага прымянення, бо не вырашаюць новаўзніклых праблем. Але практык абавязаны быць носьбітам тэарэтычных ведаў, толькі ў гэтым выпадку ён будзе прафесіяналам.

Сучасныя бібліятэказнаўства і бібліяграфазнаўства, згодна дакументалагічнай канцэпцыі, прызналі і тэрмін “кніга” – прыватным у адносінах да дакумента і чытача – прыватным выпадкам больш агульнага паняцця “карыстальнік” [9]. Аднак праблемы ад захавання да чытання ў бібліятэках застаюцца і падымаюцца да дзяржаўнага і міжнароднага ўзроўняў, калі “цена вопроса” набыла ўжо статус нацыянальных каштоўнасцей [3]. Не выпадкова М.М.Сікорскі адзначаў: «Свою роль огромной воспитательной, научной, культурной силы книга выполняет только тогда, когда ее содержание становится известным возможно большему числу людей. Именно в процессе чтения происходит великое таинство приобщения человека к новым идеям, мыслям, художественным образам. Отсюда – огромное значение процесса, обозначаемого широким и емким словом “чтение”» [8]. Стымуляванне чытацкай актыўнасці ў Беларусі таксама павінна разглядаецца як праблема, ад вырашэння якой залежыць дабрабыт нацыі [7].

Не спрыяюць вырашэнню пытанняў практычнай дзейнасці не столькі дыферэнцыяцыя (бібліятэказнаўства, бібліяграфазнаўства і кнігазнаўства), колькі, на наш погляд, недастатковая сістэмнасць у выпрацоўцы падыходаў да іх выкладання, слабае выкарыстанне менавіта кнігазнаўчых ведаў, адсутнасць дыялога паміж айчыннымі навукоўцамі ў выпрацоўцы сутнаснай тэарэтычнай асновы

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

(своеасаблівай бібліятэчнай філасофіі), адпаведнай сучаснай сацыякультурнай нацыянальнай рэчаіснасці.

Развіццё інфарматызацыі грамадства і ўзвядзенне тэхналагічных працэсаў камп'ютэрызацыі да першачарговых задач правакуюць чарговую падмену мэты сродкамі, што пагражае грамадству бездухоўнасцю. Каб пераадолець адставанне і адначасова не ісці шляхам ідэалізацыі сродкаў, неабходна вылучэнне прыярытэтных задач, скіраваных на павышэнне ўзроўню культуры індывіда (спецыяліста), прырошчванне ўласна ведаў.

Полісемічнасць (шырыня і шматзначнасць) кнігі і кнігазнаўчых ведаў, бібліялогіі, на наш погляд, дазваляюць пазбегнуць шэрага праблем, звязаных з падрыхтоўкай бібліятэкара-прафесіянала. Гэтаму спрыяе і актуальная ў наш час культуралагічная парадыгма ў галіне бібліялогіі. У прыватнасці, распрацоўваюцца такія кірункі, як бібліятэка ў гісторыі культуры [5] ці кніжная культура [2]. Атрыманне ведаў павінна быць заснавана на разуменні высокай і духоўнай місіі бібліятэкара ў зберажэнні, шанаванні, павазе і раскрыцці скарбаў кніжнай спадчыны (ад асобнага экзэмпляра да кніжных калекцый). Фарміраванне прафесійнай кнігазнаўчай культуры будучых спецыялістаў, здольных садзейнічаць адраджэнню і развіццю нацыянальнай культуры, захаванню яе як часткі агульначалавечай культурнай спадчыны – задача кнігазнаўчых дысцыплін. Адзіным стратэгічна правільным будзе менавіта спалучэнне культурных і тэхнічных навыкаў [10].

Сёння нярэдка можна назіраць сітуацыю, калі, як адзначала яшчэ Н.К.Крупская, “библиотека читателя не уважает [...] отучает от книги и от библиотеки” [9, с. 162–163]. Ці не таму, што і сам бібліятэкар не ведае, што такое “кніга” і што такое “чытанне”? Замяняючы паняцце “прафесіяналізм” родам заняткаў – прадпрымальніцтвам (напрыклад, маркетолагі, менеджэры), мы самі падштурхоўваем будучых спецыялістаў да непавагі спецыяльнасці бібліятэкара, не здымаючы праблемы непрэстыжнасці прафесіі. Прадпрымальнікі патрэбны ў любой сферы, але гэта не галоўная складаючая, не сутнасць прафесіі. Як адзначаюць навукоўцы, “калі людзі перастануць чытаць, яны перастануць думаць”, і тады пачнецца рух грамадства, адваротны духоўнасці і адукаванасці [4].

У якасці прапановы можна рэкамендаваць распрацоўку спецыяльнага, заснаванага на адзінстве канцэптуальнага падыходу, адукацыйнага модуля “Бібліятэка ў прасторы культуры”, які б

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

садзейнічаў павышэнню прафесійнага ўзроўню як практыкаў (супрацоўнікаў бібліятэк), так і будучых спецыялістаў (студэнтаў). Усе тэмы ў такім выпадку будуць разглядацца ў аспекце сучасных навуковых падыходаў: культуралагічнага, філасофскага, бібліялагічнага, а адной з асноўных задач – удасканаленне кнігазнаўчых ведаў бібліятэкараў (ад старажытнай да сучаснай кнігі і бібліятэкі, у прыватнасці, да іх інавацыйных формаў і праектаў). Праграма модуля павінна адлюстроўваць арыентацыю на дэмакратызацыю і гуманізацыю педагагічнага працэсу, а стрыжнёвая аснова – кніжная культура – стаць адкрытай прасторай для дыялога (у рэтраспектыве і перспектыве). Важны метадычны момант адукацыйнага модуля, яго прынцыповае палажэнне і стратэгія – арыентацыя на індывідуалізацыю дзейнасці бібліятэкара, на “обретение” сэнсу першаадкрыцця свету праз кнігу.

---

1. *Беловицкая, А.А.* Книговедение. Общее книговедение: учебник / А.А.Беловицкая; Моск. гос. ун-т печати. – М., 2007. – С. 168–169.

2. *Васильев, В.И.* История книжной культуры. Теоретико-методологические аспекты / В.И.Васильев; РАН. – М.: Наука, 2004. – С. 86; *Довнар, Л.И.* Книжная культура Беларуси: концептуальные основы и пути реализации научного проекта Белорусского государственного университета культуры и искусств / Л.И.Довнар, Т.А.Самойлюк // Книга – источник культуры. Проблемы и методы исследования: материалы Междунар. науч. конф. (Минск, 25–27 ноября 2008 г.) / НАН Беларуси, ЦНБ им. Я.Коласа, РАН, НЦИ истории книжной культуры. – М., 2008. – С. 123–131; *Довнар, Л.И.* Книжная культура как философско-культурологическая категория библиологии (к постановке проблемы) / Л.И.Довнар // Наука о книге. Традиции и инновации: к 50-летию сборника “Книга. Исследования и материалы”: материалы XII Междунар. науч. конф. по проблемам книговедения (Москва, 28–30 апреля 2009 г.): в 4 ч. – М.: Наука, 2009. – Ч. 1. – С. 462–465; *Самайлюк, Т.А.* Кніжная культура: сучасныя тэндэнцыі навуковых даследаванняў / Т.А.Самайлюк // Беларуская кніга ў кантэксце сусветнай кніжнай культуры: зб. навук. арт. – Мн., 2008. – Вып. 2. – С. 39–47.

3. *Коган, Е.И.* Чтение нуждается в защите / Е.И.Коган // Университетская книга. – 2005. – № 11. – С. 28–31; *Сластенко, В.А.* О некоторых проблемах чтения в современных условиях / В.А.Сластенко // Книжный мир сегодня и завтра: тез. докл.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Междунар. науч. конф. по проблемам книговедения (Москва, 22–23 мая 2002 г.) / отв. ред. Б.В.Ленский. – М.: Наука, 2002. – С. 48–50.
4. *Коган, Е.И.* Чтение нуждается в защите / Е.И.Коган // Библиотека в эпоху перемен (философско-культурологические и информационные аспекты): инф. сб. (дайджест). – М.: РГБ, 2006. – Вып. 1 (29). – С. 84.
5. *Маркова, Т.Б.* Библиотека в истории культуры / Т.Б.Маркова. – СПб.: Наука, 2008. – 327 с.
6. *Мігань, К.* Стан сучаснага кнігазнаўства як навукі / К.Мігань // Беларуская кніга ў кантэксце сусветнай кніжнай культуры: зб. навук. арт. / Беларус. дзярж. ун-т культуры і мастацтваў; склад.: Л.І.Доўнар, Т.А.Самайлюк, Т.А.Дзем'яновіч; рэдкал.: Б.У.Святлоў (адк. рэд.) [і інш.]. – Мн., 2008. – Вып. 2. – С. 28. Гл. таксама: http://www.sharpweb.org/.
7. *Морозова, С.А.* Книжный рынок Республики Беларусь: социологические заметки / С.А.Морозова, Д.Г.Ротман // Социология. – 2007. – № 2. – С. 53.
8. *Сластенко, В.А.* О некоторых проблемах чтения в современных условиях / В.А.Сластенко // Библиотека в эпоху перемен (философско-культурологические и информационные аспекты): инф. сб. (дайджест). – М.: РГБ, 2002. – Вып. 4 (16). – С. 53.
9. *Столяров, Ю.Н.* Библиотековедение, библиография и книговедение как единая научная специальность: полный курс лекций для аспирантов и соискателей / Ю.Н.Столяров. – Орёл: Орловский гос. ин-т искусств и культуры, 2007. – С. 124, 162–163.
10. *Таран, А.В.* Библиотекарь в эпоху Интернета – интеллигент или интеллектуал? / А.В.Таран // Библиотека в эпоху перемен (философско-культурологические и информационные аспекты): инф. сб. (дайджест). – М.: РГБ, 2002. – Вып. 1 (13). – С. 127.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ